Умілаваныя ў Хрысце Пану Браты і Сёстры! Дарагія Чытачы газеты “Слова Жыцця”!

Аўтар: Біскуп Гродзенскі
21.12.2014 01:00



“Я абвяшчаю вам вялікую радасць, якая будзе для ўсяго народу, бо нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан” (Лк, 2, 10–11). Гэтымі словамі анёл Пана абвясціў пастухам з Бэтлеема радасную навіну аб Нараджэння Езуса Хрыста. Прыход Божага Сына на гэты свет абуджае ў сэрцах радасць, бо з’яўляецца выра-жэннем спрадвечнай, бясконцай і загадкавай любові Бога да чалавека. У святы Божага Нараджэння мы занава перажываем таямніцу гэтай Божай любові. Яна надае сэнс нашаму жыццю, напаўняе нас даверам і супакоем; дзякуючы ёй мы адчуваем сябе шчаслівымі і спакойнымі, як любімыя дзеці нашага Айца, які ў небе. Мы прагнем дзяліцца гэтай радасцю з сям’ёй і блізкімі, з братамі ў хрысціянскай веры і з усімі людзьмі добрай волі.

У гэты святочны час шлю Вам, дарагія Браты і Сёстры, свае найлепшыя пажаданні. Няхай радасць свят Божага Нараджэння загосціць у Вашых сэр-цах, сем’ях і ў цэлым грамадстве. Няхай Езус Хрыстус, Божы Сын, які прыходзіць у гэты свет з дарам збаў-лення, узмацняе Вас у веры, надзеі і любові. Няхай Ён шчодра адорвае Вас здароўем і ўсімі патрэбнымі ласкамі.



Жадаю Вам ра-дас-ных, спакой-ных, поўных надзеі і ап-тымізму свят Божага Нараджэння, а таксама шчаслівага, багатага на Божае бласлаўленне Новага 2015 года!